Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
___________________ В. М. Міхееў
«____» ________________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД- ________/баз.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# СУСВЕТНАЯ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЭТНААРГАНАЛОГІЯ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для напрамку спецыяльнасці*
*1-16 01 06 11 Духавыя інструменты (народныя)*

Мінск
БДУКМ
2013

**СКЛАДАЛЬНІК**

*А. Л. Карацееў*, прафесар кафедры духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Б. У. Нічкоў,* загадчык кафедры драўляных духавых інструментаў установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь;

*А. І. Кавалёў,* загадчык кафедры народных інструментаў установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай духавой музыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 9 ад 30.05.2013 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 10.10.2013 г.)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. Л. Карацееў

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» для студэнтаў з'яўляецца адной з асноўных. Менавіта гэта дысцыпліна дазваляе студэнтам атрымаць дастатковыя веды аб гістарычнай эвалюцыі народнага музычнага духавога і ўдарнага інструментарыя, яго мастацка-выразных і тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцях, сацыякультурных функцыях і праблемах сучаснага выкарыстання ў мастацкай культуры. Дысцыпліна «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» звязана з такімі дысцыплінамі, як «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Нацыянальная і сусветная гісторыя выканальніцтва на народных духавых інструментах», «Сольнае і камернае інструментальнае выканальніцтва», «Народна-ансамблевае выканальніцтва», «Народна-аркестравае выканальніцтва», «Чытанне і аналіз аркестравых партытур», «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі», «Методыка работы з фальклорным калектывам» і інш.

*Мэта дысцыпліны* – падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў вышэйшай адукацыі, якія здольны выконваць розныя формы інтэрпрэтацыі народнай музыкі з улікам ведаў па сусветнай і нацыянальнай этнаарганалогіі падчас самастойнай творча-выканальніцкай і педагагічнай дзейнасці.

*Асноўныя задачы дысцыпліны:*

– атрымаць грунтоўныя гістарычныя, музычна-тэарэтычныя веды аб народным духавым і ўдарным музычным інструментарыі не толькі Беларусі, але і аналагічным сусветным музычным інструментарыі ў кантэксце вывучэння гісторыі і сучасных тэндэнцый арганафоніі;

– развіць адпаведныя музычна-творчыя навыкі вырашэння мастацкіх задач у час выканання расшыфровак, аранжыровак і інтэрпрэтацыі народнай музыкі, якія павінны выкарыстоўвацца будучымі маладымі спецыялістамі ў асабістай мастацка-прафесійнай самастойнай працоўнай творчай дзейнасці па далейшым развіцці традыцый народна-інструментальнай спадчыны Беларусі;

– у час выканання заданняў па планах індывідуальных, практычных заняткаў, падрыхтоўкі дыпломных работ рэалізаваць асабістыя творча-эксперыментальныя пошукі найбольш эфектыўных мастацка-вобразных інструментальных увасабленняў узораў нацыянальнай народнай традыцыйнай музычнай спад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыны, а таксама лепшых твораў сучасных кампазітараў Беларусі ў галіне народна-інструментальнага мастацтва;

– асэнсаваць сацыякультурную значнасць і прэстыж народна-інструментальнай спадчыны Беларусі на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– тыпалогію, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (этнаарганалагічныя асаблівасці свістковых, язычковых, амбушурных, ударных народных музычных інструментаў, іх выразна-тэхнічныя магчымасці, натацыю, строй, дыяпазон і г.д.);

– сутнасць сольнага, ансамблевага, капэльнага выканальніцтва на традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах (solo ў традыцыях народна-інструментальнай практыкі ці з выкарыстаннем сучасных і эксперыментальных выканальніцкіх тэхналогій; solo ў суправаджэнні фартэпіяна; solo ў суправаджэнні інструментальнага ансамбля ці капэлы беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў, кантрапункт, музычная арнаментыка і г.д.);

– спосаб афармлення музычнага твора для беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (solo, ансамблевая ці аркестравая партыя, партытура для ансамбля ці аркестра);

– гістарычныя эпохі і этапы эвалюцыі народных духавых і ўдарных інструментаў (сусветныя і нацыянальныя тэндэнцыі Беларусі);

– варыянты, інтэрпрэтацыі, рэдакцыі музычных твораў (параўнальны аналіз размеркавання музычнага матэрыялу ў творах з выкарыстаннем беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў);

*умець:*

– вызначаць сольныя, ансаблевыя ці аркестравыя цяжкасці;

– супастаўляць розныя штрыхавыя камбінацыі з мэтай іх дакладнага асэнсавання і размеркавання на працягу таго ці іншага твора для яго выканання з кантраснымі эфектамі;

– карэкціраваць партыі для беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (solo, ансамбль, капэла);

– вызначаць і графічна афармляць дынаміка-акустычныя асаблівасці з мэтай дасягнення будучым выканаўцам на бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рускіх народных духавых і ўдарных інструментах лагічнасці ў насычанасці гучання;

– выконваць вывучаемыя творы ці іх нотныя фрагменты на народным духавым музычным інструменце.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» ўсяго прадугледжана 120 гадзін, у тым ліку 48 гадзін аўдыторных заняткаў: лекцыі – 36 г., семінарскія заняткі – 12 г. Форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| № тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | лек. | сем. |
| | Уводзіны | 2 | |
| 1 | Этнаарганалогія як навука | 4 | 2 |
| 2 | Гісторыка-факталагічныя аспекты працэсу эвалюцыі народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі | 6 | 2 |
| 3 | Дынаміка-акустычныя асаблівасці традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | 6 | 2 |
| 4 | Тыпалогія традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у кантэксце сусветна вядомых класіфікацый музычных інструментаў | 6 | 2 |
| 5 | Мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія асаблівасці традыцыйных беларускіх народных музычных духавых інструментаў | 4 | 1 |
| 6 | Асаблівасці тэндэнцый развіцця этнаарганалогіі і арганафоніі. Асаблівасці вывучэння этнаарганалогіі Беларусі | 4 | 1 |
| 7 | Асноўныя праблемы вывучэння этнаарганалогіі. Асноўныя этапы вывучэння мастацкіх асаблівасцей беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў | 4 | 2 |
| | **Усяго…** | **36** | **12** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Сутнасць дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» і яе змест.

Структура дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія»: праблемна-тэматычныя раздзелы, выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання, формы кантролю ведаў і іспытаў.

Асноўныя задачы дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія».

Месца дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» ў сістэме падрыхтоўкі выканаўцаў на народных духавых інструментах у сферы прафесійнага выканальніцтва (сольнае, ансамблевае, капэльнае ці аркестравае).

Сувязь дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі: «Народна-інструментальная музычная культура Беларусі», «Нацыянальная і сусветная гісторыя выканальніцтва на народных духавых інструментах», «Сольнае і камернае інструментальнае выканальніцтва», «Народна-ансамблевае выканальніцтва», «Народна-аркестравае выканальніцтва», «Чытанне і аналіз аркестравых партытур», «Інтэрпрэтацыя народнай музыкі», «Методыка работы з фальклорным калектывам» і інш.

Роля набытых ведаў па дысцыпліне «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» ў прафесійным станаўленні будучых спецыялістаў духавога мастацтва Беларусі.

## Тэма 1. Этнаарганалогія як навука

Вызначэнне тэрміна «этнаарганалогія» і яго сутнасць.

Параўнальны аналіз тэрмінаў «этнаарганалогія» і «арганафонія», іх змест, аналаг з існуючымі тэрмінамі («фальклардыстыка», «інструментазнаўства», «этнаграфія» і інш.).

Гістарычныя звесткі аб з’яўленні тэрмінаў «этнаарганалогія» і «арганафонія».

Асноўныя этапы станаўлення этнаарганалогіі і яе асноўныя метады даследавання.

Народныя духавыя і ўдарныя музычныя інструменты як гістарычныя сведкі і састаўныя элементы ўзроўню развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў свету, у тым ліку і беларускага народа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Метад назірання ў працэсе вырабу старажытных духавых і ўдарных музычных інструментаў (унікальны музычны комплекс з касцей мамантa і іншыя прыклады арганалагічных асаблівасцей старажытнага музычнага інструментарыя).

Сутнасць арганалагічнага метаду даследавання народнага інструментарыя, яго спецыфіка і кола вядучых навукоўцаў, даследуючых асаблівасці народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя.

Сутнасць музычна-эстэтычнага метаду даследавання па вывучэнні народнага інструментарыя, яго спецыфіка і кола вядучых навукоўцаў.

Вядучыя спецыялісты Беларусі па вывучэнні традыцыйнага нацыянальнага народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя.

Этнаарганалагічныя асаблівасці традыцыйнага нацыянальнага народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі і яго ўкараненне ў сучасную практыку народна-інструментальнага музіцыравання.

Беларуская этнаарганалогія як эфектыўная форма папулярызацыі ведаў аб народна-інструментальнай нацыянальнай спадчыне беларускага народа.

## Тэма 2. Гісторыка-факталагічныя аспекты працэсу эвалюцыі народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі

Факталагічны звод інфармацыі аб існаванні, эвалюцыі і функцыянаванні народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі.

Аналіз археалагічных знаходак народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя на тэрыторыі Беларусі (сучасныя тэрыторыі Віцебскай, Брэсцкай, Гродзенскай абласцей і памежныя рэгіёны).

Аналіз дакументальных крыніц аб існаванні народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя на тэрыторыі Беларусі ў храналагічным парадку («Литовская летопись по списку, находящемуся в библиотеке графа Красновского», «Кройника літовская і жмойтская», «Попіс войска Літовского» і інш.).

Народны духавы і ўдарны музычны інструментарый у быце беларусаў. Традыцыйны народны духавы і ўдарны музычны інструментарый як дамінуючы кампанент музычнага афарм-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лення розных народных абрадаў, звязаных з каляндарнымі святамі (зажынкі, Купалле, Шчадрэц і інш.).

Роля традыцыйнага народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя ў культурным жыцці старажытных гарадоў Беларусі (музычныя інструменты ў час правядзення кірмашоў у гандлёвых радах, корчмах, балаганах, суправаджэнні прадстаўленняў народнага тэатра лялек – батлейкі і інш.).

Народны духавы і ўдарны музычны інструментарый беларусаў як неад'емны элемент цэласнага ўтылітарна-мастацкага вобраза беларускага нацыянальнага касцюма гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі (Цэнтральная Беларусь, Панямонне, Заходняе і Усходняе Палессе, Прыдняпроўе і Падзвінне).

Экспазіцыя традыцыйных народных духавых і ўдарных музычных інструментаў у фондах вядучых музеяў Беларусі і замежжа.

## Тэма 3. Дынаміка-акустычныя асаблівасці традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў

Музычны гук і яго асаблівасці ўспрымання ў гучанні беларускіх народных духавых і ўдарных музычных інструментаў. Асноўныя віды музычнага слыху (бінарны, абсалютны, стылявы і інш.).

Галоўныя састаўныя часткі беларускіх народных духавых і ўдарных музычных інструментаў (гучальнае цела ці вібратар, гукаўтваральнік, рэзанатар і інш.). Фактары, якія абумоўліваюць спецыфіку прыёмаў гуказдабывання на беларускіх народных духавых інструментах (наяўнасць абертонаў, матэрыял, з якога вырабляецца музычны інструмент, таўшчыня ці маса гучальнага цела, спосаб гукаўтварэння, велічыня мензуры).

Паняцце «штрых», яго сутнасць і роля ў выканальніцкім музычным мастацтве. Разнавіднасці штрыхоў, якія выкарыстоўваюцца пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах. Умоўныя абазначэнні асноўных штрыхоў, развіццё навыкаў іх выканання. Штрыхі як сродак артыкуляцыі.

Элементы і стадыі выканання штрыхоў.

Асаблівасці і прыёмы гуказдабывання пры выкананні штрыхоў. Сутнасць узаемасувязі гуказдабывання і выканання штрыхоў.

Спецыфічныя штрыхі і прыёмы гуказдабывання, распаўсюджаныя ў народна-інструментальнай выканальніцкай практыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Фразіроўка.

Сутнасць захоўвання спецыфікі дакладнасці фразіроўкі пры ігры на беларускіх народных духавых інструментах з улікам іх дынаміка-акустычных, этнаарганалагічных асаблівасцей.

Праблемы дынаміка-акустычнага балансу пры выкананні на беларускіх народных духавых (ударных) інструментах solo, у складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў. Дынаміка як мастацка-выразны сродак музычнага мастацтва і яе спецыфіка з улікам гучання беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў.

Паняцце аб рэльефе, фоне, аб'ёме і балансе гучання на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах. Шляхі дасягнення аб'ёму прасторавага гучання. Развіццё выканальніцкіх навыкаў для дасягнення збалансаванага гучання ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

Прынцыпы кантрасту дынамікі гучання на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах.

Узаемасувязь дынамікі і музычнай фактуры ў працэсе выканальніцтва ў складзе камерна-інструментальнага ансамбля з фартэпіяна, ансамбля ці аркестра народных інструментаў.

## Тэма 4. Тыпалогія традыцыйных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у кантэксце сусветна вядомых класіфікацый музычных інструментаў

Старажытныя і сучасныя сусветна вядомыя сістэмы класіфікацыі тыпавога традыцыйнага і мадыфікаванага інструментарыя, яго функцыі, мастацка-выканальніцкія асаблівасці (чатыры групы музычных інструментаў: 1) ідэафоны; 2) мембранафоны; 3) хардафоны; 4) аэрафоны).

Тыпавыя выканальніцкія формы, у якіх выкарыстоўваюцца народныя духавыя інструменты. Спецыфіка ўключэння народных духавых інструментаў у сучасную выканальніцкую практыку (сольнае выканальніцтва; ансамблевае выканальніцтва; аркестравае выканальніцтва).

Асаблівасці інтанавання пры выкананні на беларускіх народных духавых інструментах (канструктыўныя і тэхналагічныя недахопы і шляхі іх пераадольвання). Узаемаабумоўленасць дакладнага інтанавання і арганалагічных асаблівасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыфіка і асноўныя віды настройкі духавых інструментаў.

Выкарыстанне розных спосабаў настройкі з улікам этнааргавалагічных асаблівасцей беларускіх народных духавых інструментаў.

Улік асаблівасцей і спосабаў карэкціроўкі інтанавання беларускіх народных духавых інструментаў у працэсе сольнага ці сумеснага выканальніцтва: 1) прынцып ладатанальнага прыцягнення; 2) выкарыстанне дадатковай аплікатуры; 3) змяненне параметраў апертуры і амбушура; 4) карэкцыя экспрэсіі выканальніцкага дыхання.

### Тэма 5. Мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія асаблівасці традыцыйных беларускіх народных музычных духавых інструментаў

Дакладныя характарыстыкі мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей тыпавога традыцыйнага і сучаснага мадыфікаванага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі.

Мастацка-выканальніцкая спецыфіка сучаснага мадыфікаванага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі.

Строй, дыяпазон, характарыстыка гучання, натацыя традыцыйных і мадыфікаваных сучасных беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў:

– лабіяльныя ці флейтавыя: 1) свісцячыя ці дульцавыя (свісцёлка, акарына ці «карына», сасудападобная «салавейка»); 2) прадольныя флейты (дудка-piccolo in F, дудка-сапрана in C, дудка-альт in D, in G, дудка-тэнар in F, дудка-бас in C; поршневая дудка; дудка без ігравых адтулін); 3) састаўныя дудкі (парныя дудкі ці «парнёўкі» in F);

– лінгвальныя ці язычковыя: 1) так званыя «вольныя аэрафоны» ці духавыя інструменты з вольным язычком (ліст дрэва, ліст травы, «карынка», «берасцянка»); 2) з адзінарным пішчыкам («саломка», «пішчык», «чаратоўка» ці «чаротка», «жалейка» – дыятанічная і разнастайнасці храматычнай жалейкі in C, in E, in A, in G, in F, in D у розных тэсітурах гучання; дуда; язычковы рог);

– амбушурныя ці муштучныя: 1) разнастайнасці труб (трубы з бяросты ці так званыя «берасцянкі», «крывенькія трубы», «трубы-ражкі» з муштуком; падоўжаныя цыліндрычныя драўляныя трубы з муштуком ці разнастайнасці з муштучным

прыстасаваннем, зробленым у вусці інструмента); 2) рогі (амбушурны рог і спецыфічныя выканальніцкія прыёмы ігры);

– ідэафоны: 1) саўдараемыя ідэафоны («калотка», «лыжкі», «талеркі»); 2) ударнаемыя ідэафоны («вугольнік», «брусочкі», «біла», «звон», «званок»); 3) патрэсваемые ідэафоны («кляшчоткі», «бразготкі», «шархуны»); 4) скрабковыя ідэафоны («трашчотка»); 4) шчыпковыя ідэафоны (гетэраглотачны «варган»);

– мембранафоны: 1) рамныя барабаны (аднабаковыя «бубны», аднабаковыя цыліндрычныя «барабаны»); 2) мірлітоны – «грэбень»).

## Тэма 6. Асаблівасці тэндэнцый развіцця этнаарганалогіі і арганафоніі. Асаблівасці вывучэння этнаарганалогіі Беларусі

Тэндэнцыя этнаарганалагічна-мадыфікацыйных пошукаў і яе сутнасць.

Асаблівасці працэсу рэканструкцыі і мадыфікацыі традыцыйнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі. Асноўныя задачы рэканструкцыі традыцыйных беларускіх духавых і ўдарных народных інструментаў Беларусі. Працэсы мадыфікацыі традыцыйных беларускіх духавых і ўдарных народных інструментаў Беларусі. Дзейнасць М. Астрэйкі па ўдасканаленні вырабу беларускіх дудак (дудка-*сапрана* in C, дудка-*сапрана* in B, дудка-*альт* in F, дудка-*бас* in F). Сучасныя пошукі музычных майстроў Беларусі па вырабе і ўдасканаленні традыцыйнага народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя.

Сутнасць тэндэнцыі ўзбагачэння нацыянальнага музычнага мастацтва і нацыянальнай мастацкай культуры з улікам уключэння традыцыйнага народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя ў розныя формы выканальніцкай практыкі. Замацаванне рэканструяваных, выработленых ці мадыфікаваных традыцыйных народных духавых, ударных музычных інструментаў як эфектыўны стымул пашырэння прыярытэтных кірункаў музычнага мастацтва і нацыянальнай культуры ўвогуле. Роля рэгіянальных дасягненняў выкарыстання традыцыйных народных духавых, ударных музычных інструментаў у працэсе пашырэння нацыянальнай агульнакультурнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 7. Асноўныя праблемы вывучэння этнаарганалогіі. Асноўныя этапы вывучэння мастацкіх асаблівасцей беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў

Сутнасць, месца і асноўныя аспекты этнаарганалагічных даследаванняў у сістэме засваення нацыянальнай культурнай спадчыны. Сувязь этнаарганалогіі і арганафоніі з мноствам мастацкіх сістэм і сукупнасцю іх элементаў. Этнаарганалогія як аб’ект спецыяльнага вывучэння. Прычына адсутнасці спецыяльных этнаарганалагічных даследаванняў да сярэдзіны XX ст. (роля адзінкавых кваліфікаваных і апантаных даследчыкаў у працэсе вывучэння народнага музычнага інструментарыя Беларусі, пошукі ўзораў аўтэнтычнага інструментальнага фальклору і тэхналогія яго фіксацыі да XX ст.). Сучасныя ўмовы ажыццяўлення спецыяльных этнаарганалагічных даследаванняў. Неабходнасць стварэння нацыянальных музычна-аналітычных этнаарганалагічных каталогаў па папулярызацыі спецыяльных ведаў аб багацці народна-інструментальнай спадчыны, у тым ліку духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя. Праблемы вывучэння арганафоніяй функцый музычных інструментаў.

Асноўныя задачы па вывучэнні этнаарганалагічных асаблівасцей народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя. Народныя духавыя і ўдарныя музычныя інструменты як значныя помнікі матэрыяльнай і духоўнай культуры народа. Народныя музычныя інструменты як традыцыйныя фіксатары беспісьмовай музыкі і носьбіты нотнага тэксту. Канструктыўныя асаблівасці народных духавых і ўдарных музычных інструментаў і мастацка-выразная абумоўленасць музыкі, якую выконваюць на іх. Уплыў акустычных, мастацка-выразных асаблівасцей народных духавых і ўдарных музычных інструментаў на асноўныя кампаненты народна-інструментальнай музыкі.

Этапы і іх змест у працэсе вывучэння мастацкіх асаблівасцей беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў (візуальнае ўспрыманне пры дапамозе малюнка, графічнага адлюстравання, знаёмства з экспанатамі музея ці выставы; аўдыявізуальнае ўспрыманне ў час выступлення музыкантаў на канцэрце ці трансляцыі гэтага выступлення па радыё, тэлебачанні, аўдыя- ці відэазапісаў; вывучэнне спецыяльнай літаратуры; далучэнне да выканальніцкага працэсу).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*1. Алексеева, Н.* Новая жизнь пастушьего рожка / Н. Алексеева // Советская музыка. – 1982. – № 8. – С. 66–67.

*2. Антоневич, В. А.* Народное исполнительское искусство как один из источников обогащения профессионального творчества на современном этапе / В. А. Антоневич // Вопросы культуры и искусства Белоруссии : Респ. межвед. сб. – Мінск : Выш. шк., 1982. – Вып. 1. – С. 68–71.

*3. Беларуская* народная інструментальная музыка : фоназапісы, натацыя / рэд. і сістэматызацыя найгрышаў, уступ. арт. і навук. камент. І. Д. Назінай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 655 с. – (Беларус. нар. творчасць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору).

*4. Белорусские* народные наигрыши / сост. и авт. вступ. ст. И. Д. Назина ; под общ. ред. В. Петрова. – М. : Музыка, 1986. – 12 с.

*5. Благовещенский, И. П.* К истории белорусской народной инструментальной музыки / И. П. Благовещенский / И. П. Благовещенский // Некоторые вопросы музыкального искусства (педагогика, эстетика, фольклор). – Минск : Наука и техника, 1965. – С. 103–143.

*6. Бярбераў, У.* Дудка беларуская / У. Бярбераў // Культура. – 1992. – Люты (№ 5). – С. 3.

*7. Бярбераў, У.* Жалейка / У. Бярбераў // Культура. – 1992. – Люты (№ 6). – С. 8.

*8. Бярбераў, У.* Іду да дудароў / У. Бярбераў // Культура. – 1992. – Люты (№ 7). – С. 7.

*9. Гром, У. М.* Дуда ў фальклорна-інструментальнай творчасці беларусаў / У. М. Гром // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе : вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – С. 81–86.

*10. Гром, У. М.* Дударэньку-гаспадэньку : рэпертуар. зб. для аматараў ігры на дудзе / У. М. Гром. – Мінск : БелІПК, 1999. – 54 с.

*11. Гром, У. М.* Заіграйце, музыкі! : рэпертуар. зб. для фальклорных калектываў : у 2 ч. / У. М. Гром. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч. 1. – 111 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

12. *Гром, У. М.* Заіграйце, музыкі! : рэпертуар. зб. для фальклорных калектываў : у 2 ч. / У. М. Гром. – Мінск : Чатыры чвэрці, 1998. – Ч. 2. – 155 с.

13. *Гром, У. М.* Сядзіць галубок над крыніцаю : зб. беларус. нар. песень / У. М. Гром ; Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1999. – 68 с.

14. *Гром, У.* Галасы мінуўшчыны : зб. інструм. ансамбляў для беларус. нар. духавых інструментаў / У. Гром, А. Крамко, І. Мангушаў; Беларус. дзярж ін-т культуры. – Мінск, 2003. – 130 с.

15. *Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 1. Сольнае выкананне. – 259 с.

16. *Гром, У. М.* Школа ігры на беларускіх народных духавых інструментах : вучэб.-метад. дапам. / У. М. Гром, А. Я. Крамко, І. А. Мангушаў. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – Ч. 2. Ансамблевае выкананне. – 217 с.

17. *Имханицкий. М. И.* Сколь народны народные инструменты / М. И. Имханицкий // Народныя музычныя інструменты ў мастацкай культуры XX стагоддзя : зб. навук. арт. / рэдкал. : Н. П. Яканюк (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – С. 8–20.

18. *Коротеев, А. Л.* Генезис образования специалистов духового исполнительского искусства Беларуси (народно-инструментального, профессионального и любительского) / А. Л. Коротеев // Музыкальное искусство и музыкальное образование на рубеже веков : материалы научных конференций «Беларусь и музыкальное наследие XX столетия : поиски и обретения», 29–30 нояб. 2001 г., Минск, «Музыкальное образование в контексте художественной культуры», 10–11 дек. 2002 г., Минск. – Вып. 1. – Минск : Белорус. гос. акад. музыки, 2004. – С. 138–146.

19. *Коротеев, А. Л.* Бытование амбушюрных духовых музыкальных инструментов в Беларуси (по материалам археологических изысканий, архивных исследований и анализа печатных изданий в контексте славянской органологии) / А. Л. Коротеев // IV Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры : матэрыялы чытанняў, Мінск, 24–26 мая 1998 г. : у 2 ч. / ЕГУ, БУК ; рэдкал. : А. У. Пазнякоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – Ч. 2. – С. 168–176.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20. *Коротеев, А. Л.* Особенности развития духового искусства Восточной Европы : органологическое исследование и эволюция форм народно-инструментального исполнительства на духовых и ударных инструментах / А. Л. Коротеев // Украiньска культура в iменах i дослiдженнях. Науковi записки Рiвненьского державного iнституту культури. – Вiп. III – Рiвне : Рiвненський державний iнститут культури, 1998. – С. 296–320.

21. *Коротеев, А. Л.* Фольклорные духовые инструменты белорусов в этнокультурном воспитании и художественном образовании детей и молодежи (от музыкальной игрушки до разнообразия национального инструментария) / А. Л. Коротеев // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе : вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – С. 87–94.

22. *Коротеев, А. Л.* Функциональные и этноорганологические особенности белорусских народных духовых инструментов / А. Л. Коротеев // X Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, Мінск, 24–26 мая 2004 г. / рэдкал. : М. А. Бяспалая (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 66–72.

23. *Карацееў, А. Л.* Народны духавы музычны інструментарый Беларусі як гістарычная сведка развіцця нацыянальнай культуры і яго месца ў сусветнай арганалогіі і арганафоніі / А. Л. Карацееў // Зб. тэзісаў дакладаў на навук.-метад. канф. прафесарска-выкладчыцкага складу. – Мінск : МІК, 1993. – Ч. 1. – С. 21–26.

24. *Карацееў, А. Л.* Неардынарная з’ява нацыянальна-выканальніцкага адраджэння / А. Л. Карацееў // Весн. БДУ культуры і мастацтваў. – 2005. – № 5. – С. 119–122.

25. *Казловіч, М. І.* Змест каляндарна-абходнай абраднасці беларусаў і асаблівасці яго гукаінструментальнага выяўлення / М. І. Казловіч // Вес. Беларус. дзярж. акад. музыкі. – 2002. – № 2. – С. 47–52.

26. *Крамко, А. Я.* Беларускія народныя духавыя інструменты : вучэб. дапам. / А. Я. Крамко. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – 34 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*27. Мишуров, Г. С.* Белорусское народно-инструментальное искусство : традиции и современность / Г. С. Мишуров. – Минск : Белорус. гос. ун-т культуры, 2002. – 300 с.

*28. Назина, И. Д.* Белорусские народные музыкальные инструменты : Самозвучащие, ударные, духовые / И. Д. Назина ; ред. М. Я. Гринблат. – Минск : Наука и техника, 1979. – 144 с. : ил.

*29. Назина, И. Д.* Становление и развитие белорусского этноинструментоведения как специальной научной дисциплины / И. Д. Назина // Белорусская этномузыкалогия : Очерки истории (XIX–XX вв.) / З. Можейко, Т. Якименко, Т. Варфоломеева [и др.] ; под. ред. З. Можейко. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – С. 199–234.

*30. Назіна, І. Д.* Беларускія народныя музычныя інструменты / І. Д. Назіна. – Мінск : Беларусь, 1997. – 239 с.

*31. Ничков, Б. В.* Народные духовые инструменты в культурной жизни белорусского народа / Б. В. Ничков. – Минск : РНМЦ, 1978. – С. 5–15.

*32. Прывалаў, Н.* Народныя музычныя інструменты Беларусі / Н. Прывалаў. – Менск, 1928.

*33. Скарабагатчанка, А. В.* Беларускі музычны фальклор. Інструментальная традыцыя / А. В. Скарабагатчанка ; Рэсп. навук.-метад. цэнтр. культуры, Мінскі ін-т культуры. – Мінск, 1990. – 161 с.

*34. Скарабагатчанка, А.* Народная інструментальная культура Беларускага Паазер'я / А. Скарабагатчанка. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 471 с. : іл., нот.

*35. Яконюк, Н. П.* Народно-инструментальная музыкальная культура письменной традиции Беларуси : атрибутивные типологические признаки / Н. П. Яконюк // Вес. Беларус. дзярж. акад. музыкі. – 2002. – № 2. – С. 44–46.

*36. Яконюк, Н. П.* Народно-оркестровая культура Белоруссии : традиции и новаторство / Н. П. Яконюк // Роль оркестров народных инструментов в межэтническом общении : сб. / Рос. акад. музыки им.Гнесиных. – М., 1999. – Вып. 153. – С. 49–75.

*Дадатковая*

*1. Алефірэнка, В.* Параўнальна-марфалагічны аналіз беларускай і польскай дуды / В. Алефірэнка // Музычная культура Беларусі : Пошукі і знаходкі : матэрыялы VII навук. чытанняў памяці Л. С. Мухарынскай (1906–1987). – Мінск : Беларус. дзярж. акад. музыкі, 1998. – С. 72–76.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. *Андерсен, А.* Новый самоучитель игры на окарине / А. Андерсен. – М. : Издание Ю. Г. Циммермана, 1889. – 27 с.

3. *Волынский, Лад.* Новейшая практическая и легкопонятная школа для окарины. Удобная для самоучения с добавлением 30 пьес для одной окарины и 3 пьес для 2 окарин / Лад Волынский. – Киев : Издание Г. И. Ииндржишека. – 32 с.

4. *Інструментальная* музыка Беларусі XVIII стагоддзя / Рэсп. метад. кабінет па навуч. установах мастацтваў і культуры ; склад. В. У. Дадзіёмава. – Мінск, 1991. – 111 с.

5. *Козлова, А.* Над поставским Поозерьем плакала жалейка… / А. Козлова // Рэспубліка. – 17 чэрв. 1998. – С. 5.

6. *Коротеев, А. Л.* Дисбаланс квалификационно-педагогических компонентов системы подготовки специалистов профессионального и любительского духового искусства Беларуси / А. Л. Коротеев // Проблемы развития педагогического образования : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 17 дек. 2004 г. / Белорус. гос. пед. ун-т имени М. Танка ; редкол. : К. В. Гавриловец [и др.] ; отв. ред. А. В. Торхов, З. С. Курбыко. – Минск : БГПУ, 2005. – С. 375–377.

7. *Коротеев, А. Л.* Духовое искусство Беларуси : жанрово-стилистические поиски и перспективы развития / А. Л. Коротеев // Музыкальное искусство на рубеже столетий : материалы Междунар. науч. конф. «Музыкальное творчество и XXI век : традиции, новации и перспективы», г. Минск, 21 апр. 2000 г. – Минск : Технопринт, 2000. – С. 41–45.

8. *Коротеев, А. Л.* Использование функционально-ролевых игр в процессе подготовки специалистов духового искусства высшей квалификации Беларуси (народные и оркестровые духовые, ударные инструменты) / А. Л. Коротеев // Игровые технологии в современном воспитательном процессе : материалы Респ. науч.-практ. конф., 12–13 февр. 2004 г., Мозырь : в 3 ч. Ч. 1. – Мозырь : УО МГПУ, 2004. – С. 18–21.

9. *Коротеев, А. Л.* Нравственно-эстетические и художественно-творческие критерии формирования профессиональных способностей исполнителей на духовых инструментах / А. Л. Коротеев // Маральна-эстэтычнае выхаванне моладзі сродкамі мастацтва і літаратуры : матэрыялы Міжнар. навук. канф., 24–25 лют. 2000 г. / рэдкал. : А. У. Пазнякоў (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – С. 63–67.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. *Караткевіч, А. А.* Аб некаторых метадычных падыходах да навучання ігры на дудцы (пачатковая ступень музычнай адукацыі) беларусаў / А. А. Караткевіч // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе : вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – С. 229–237.

11. *Карацееў, А. Л.* Забеспячэнне працэсу падрыхтоўкі спецыялістаў у ВНУ культуры і мастацтваў Беларусі (вучэбна-метадычныя і арганізацыйныя аспекты) / А. Л. Карацееў // Кафедра як асноўны цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў да дзейнасці ў сацыякультурнай і інфармацыйна-камунікатыўнай сферах : матэрыялы навук.-метад. канф., 19–20 лют. 2004 г. / рэдкал. : А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2005. – С. 51–54.

12. *Карацееў, А. Л.* Роля прагрэсіўных тэхналогій падрыхтоўкі спецыялістаў духавога мастацтва ў працэсе распрацоўкі сучасных адукацыйных стандартаў / А. Л. Карацееў // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі : тэарэтыка-метадалагічныя аспекты : матэрыялы навук.-метад. канф., 2–3 лют. 1999 г. / рэдкал. : А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – С. 91–96.

13. *Мангушаў, І. А.* Праблемы рэканструкцыі, вырабу і ўкаранення ў сучасную музычную культуру старажытных фальклорных духавых інструментаў беларусаў // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе : вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – С. 220–229.

14. *Народные* музыкальные инструменты и инструментальная музыка : сб. ст. и материалов в двух частях. Часть первая. – М. : Сов. композитор, 1987. – 264 с. : ил.

15. *Народные* музыкальные инструменты и инструментальная музыка : сб. ст. и материалов в двух частях. Часть вторая. – М. : Сов. композитор, 1987. – 327 с. : ил.

16. *Музыкальные* инструменты мира / пер. с англ. Т. В. Лихач ; худож. обл. М. В. Драко. – Минск : Попурри, 2001. – 320 с. : ил.

17. *Ничков, Б. В.* Фольклорные духовые инструменты в устной поэзии белорусов // «Этнашкола» ў сучасным адукацыйным працэсе : вопыт станаўлення і перспектывы развіцця (да 10-годдзя існавання) / уклад. і навук. рэд. праф. І. І. Сучкоў. – Мінск : Бестпринт, 2004. – С. 208–220.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*18. Сёке, П.* Существовала ли музыка до возникновения жизни на Земле? / П. Сёке // Иностранная литература. – 1983. – № 9. – С. 204–207.

*19. Філіповіч, А.* Дудка... на каленях / А. Філіповіч // Культура. – 2000. – Чэрв. (№ 23-24). – С. 4.

*20. Черных, А.* Советское духовое инструментальное искусство : справочник / А. Черных. – М. : Музыка, 1989. – 320 с.

*21. Яканюк, Н. П.* Народна-інструментальная музычная культура Беларусі : да пытання фарміравання нацыянальнага інструментарыя / Н. П. Яканюк // Культура Беларусі : Спадчына і сучаснасць : тэзісы дакладаў на навук. канф., 18–19 крас. 1996 г. / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1997.

*22. Hornbostel, E.* Systematik der Musikinstrumente / E. Hornbostel, C. Sachs // Zeitshrift fur Ethnologue. – 1914. – Bd. XLVI, 4–5. – S. 553–590.

*23. Moszynski, K.* Polesie Wscodnie. Materijaly etnograficzhne z wscodniego czessci b. Powiatu Mozyrskiego oraz z powiatu Rzeczyckiego / K. Moszynski. – Warzawa, 1928. – 304 s.

*24. Pietkiewicz, Cz.* Polesie Rzecsyckie. Cz. 2. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego : Materijaly etnograficzhne / Cz. Pietkiewicz. – Warzawa, 1938. – 459 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый, выяўлення ўзроўню засваення ведаў і ўменняў па дысцыпліне рэкамендаваны наступны інструментарый:

– падрыхтоўка пісьмовых кантрольных заданняў;

– напісанне рэфератаў, анатацый па асобных раздзелах дысцыпліны;

– вызначэнне адпаведнага спіса спецыяльнай літаратуры па асобных раздзелах дысцыпліны з мэтай напісання тэматычных анатацый аб мастацка-выразных і функцыянальных асаблівасцях беларускіх народных духавых і ўдарных музычных інструментаў;

– напісанне па асобных тэмах дысцыпліны дакладаў на выніковыя навуковыя канферэнцыі аспірантаў, магістрантаў і студэнтаў;

– франтальнае вуснае апытанне студэнтаў на семінарах па тэмах дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў па дысцыпліне «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» ажыццяўляецца падчас пазааўдыторных заняткаў у бібліятэках, лабараторыі музычных інструментаў універсітэта, ва ўстановах культуры, Інтэрнэце. З мэтай яе эфектыўнай арганізацыі студэнтам мэтазгодна выконваць адпаведны аб'ём работы пасля знаёмства з матэрыяламі лекцыйных заняткаў і падчас падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў.

Дзеля ажыццяўлення самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў з мэтай засваення неабходных матэрыялаў дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» ім неабходна вызначыць сутнасць і змест тэрмінаў *арганалогія*, *этнаарганалогія*, *арганафонія*, *транспазіцыя*, *інтэрвал транспазіцыі* і адзначыць іх у пісьмовай форме ў асабістых канспектах.

З мэтай актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў прапануецца работа са спецыяльнай літаратурай бібліятэчных фондаў па засваенні асаблівасцей гісторыка-факталогічных аспектаў працэсу эвалюцыі народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі з улікам прынцыпу храналогіі і адлюстравання найбольш вядомых гістарычных падзей і фактаў сучаснага існавання народнага музычнага інструментарыя.

Падчас падрыхтоўкі адпаведных матэрыялаў па вывучэнні дысцыпліны «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія» ў студэнтаў павінны сфарміравацца ўменні і навыкі пошуку, адбору неабходных крыніц і самастойнага набыцця ведаў у працэсе абагульнення праблемна-тэматычнай інфармацыі.

Эфектыўным спосабам засваення адпаведных ведаў па практычных пытаннях характарыстыкі народнага духавога і ўдарнага музычнага інструментарыя Беларусі павінна стаць пісьмовая характарыстыка беларускіх народных духавых і ўдарных музычных інструментаў з улікам іх функцыянальных і мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей (лабіяльныя ці флейтавыя; лінгвальныя ці язычковыя; амбушурныя ці муштучныя; ідэафоны; мембранафоны).

Важнай умовай засваення трывалых ведаў студэнтамі па дысцыпліне «Сусветная і нацыянальная этнаарганалогія»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'явіцца знаёмства з нотным матэрыялам твораў, якія прызначаны дзеля выканальніцтва на беларускіх народных духавых і ўдарных інструментах (*solo, ансамбль, капэла*), а таксама адбор і праслухоўванне адпаведных фанаграм з мэтай вывучэння мастацка-выразных асаблівасцей узораў выступленняў сусветна вядомых і лепшых айчынных выканаўцаў на народных духавых і ўдарных музычных інструментах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам тэрміналогіі, асобных фактаў, з'яў, крытэрыяў і форм кантролю вывучаемай дысцыпліны |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны |
| 3 (тры) | Недастатковы адказ студэнтам на пытанні праграмнага матэрыялу аб асобных тэмах, асобных інструментах, вывучэнні зместу дысцыпліны падчас самастойнай работы над прапануемымі інфармацыйнымі крыніцамі |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам матэрыялу вывучаемай дысцыпліны (ролі і месца беларускіх народных духавых інструментаў у сучаснай культурна-адукацыйнай прасторы, шляхоў і сродкаў засваення тыпалогіі музычнага народнага духавога інструментарыя ў кантэксце сусветнай і нацыянальнай этнаарганалогіі). Веданне спецыяльнай гістарычнай, вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Наяўнасць неістотных памылак |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне спецыяльнай вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратуры па музычна-эстэтычным выхаванні і навучанні. Наяўнасць неістотных памылак |
| 7 (сем) | Трывалыя веды па асноўных кірунках дысцыпліны, раскрыццё мастацка-функцыянальных асаблівасцей беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у сучасных умовах развіцця культуры. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 8 (восем) | Дастатковыя веды па асноўных тэмах дысцыпліны аб мастацка-функцыянальных асаблівасцях беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у сучасных умовах развіцця культуры. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне асабістых вывадаў канкрэтнымі прыкладамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па спецыяльных дысцыплінах. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 9 (дзевяць) | Трывалыя веды па асноўных тэмах дысцыпліны аб мастацка-функцыянальных асаблівасцях беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у сучасных умовах развіцця культуры. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць асаблівасці беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў, карыстацца вучэбна-педагагічнай, навукова-метадычнай і нотнай літаратурай. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак |
| 10 (дзесяць) | Поўныя, трывалыя і глыбокія веды. Глыбокае асэнсаванне праблем па асноўных тэмах дысцыпліны аб мастацка-функцыянальных асаблівасцях беларускіх народных духавых і ўдарных інструментаў у сучасных умовах развіцця культуры. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацвярджэнне аргументамі і фактамі. Уменне кваліфікавана аналізаваць вучэбна-педагагічную, навукова-метадычную і нотную літаратуру. Адсутнасць памылак |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**СУСВЕТНАЯ І НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ЭТНААРГАНАЛОГІЯ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для напрамку спецыяльнасці*
*1-16 01 06 11 Духавыя інструменты (народныя)*

Карэктар В. Б.Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М.Мельнік

Падпісана ў друк 2014. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,51. Ул.-выд. арк. 1,01. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ